УДК 373.2

***Вяч.М. Смаль***
*канд. філал. навук, дац., дац. каф. спецыяльных педагагічных дысцыплін*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна*
e-mail: pedchild@brsu.brest.by

# ФАРМІРАВАННЕ ЭМАЦЫЙНА-АЦЭНАЧНАЙ ЛЕКСІКІ ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ

*Разглядаецца методыка фарміравання эмацыйнай лексікі дашкольнікаў, аналізуецца ўплыў эмацыйна-экспрэсіўнага лексікона на агульнае маўленчае развіццё асобы дзіцяці, апісаны працэс увядзення ў актыўны лексікон дзяцей этыкетнай лексікі, раскрываюцца эфектыўныя метады і прыёмы азнаямлення дзяцей дашкольнага ўзросту з эмацыйна афарбаванымі лексічнымі адзінкамі на спецыяльна арганізаваных занятках на аснове комплексна-тэматычнага падыходу і інтэграцыі розных відаў дзейнасці.*

Эмоцыі з'яўляюцца матывацыйнай асновай мыслення і маўленчых павозін чалавека, садзейнічаюць засваенню асобай пэўнага слоўнага корпусу для паўнавартаснай, ёмістай перадачы сваіх думак і пачуццяў. Эмоцыі асобы фарміруюць эмацыйнасць маўлення; у сваю чаргу, сама эмацыйнасць мае маўленчую прыроду, рэалізуецца дзякуючы механізмам мовы і праяўляецца ў маўленні. Агульнае павышэнне функцыі эмоцый у сучасным грамадстве, культуры, палітыцы, эканоміцы, побыце Н.В. Аванесава тлумачыць шматлікімі сацыяльнымі, палітычнымі, прыроднымі і тэхналагічнымі катаклізмамі ў свеце, абумоўлівае «агульным праяўленнем свабоды, глабальным эмацыянальным разняволеннем чалавека, які перастаў палохацца адкрыта выражаць свае эмоцыі як у маўленчай форме, так і па-за маўленнем» [1, с. 5].

У мовазнаўстве існуе шэраг да канца не вырашаных праблем: тэрміналагічная акрэсленасць паняцця «лексічная эмацыйнасць» і яго канстытуцыйная напоўненасць, падмена паняцця «эмацыйнасць» тэрмінам «экспрэсіўнасць», які не з'яўляецца сінанімічным эквівалентам (В.І. Шахоўскі) і інш. Традыцыйна эмацыйнасць выказвання разглядаецца на ўзроўні лексікі, сінтаксісу, фанетыкі, стылю, на матэрыяле розных часцін мовы (назоўнікаў, дзеясловаў, прыметнікаў, прыслоўяў, выклічнікаў), на ўзроўні невербальных зносін (інтанацыя, міміка, жэсты). Пры гэтым падзел моўных адзінак на лагічныя і эмацыйныя не ў поўнай меры апраўданы, бо патэнцыяльна кожная з іх можа мець эмацыйную афарбоўку ў залежнасці ад кантэксту і нават ад індывідуальна-суб'ектыўнага ўспрымання маўлення слухачом, яго эмацыйнага вопыту і настрою, ролі вызначаемых словам падзей і прадметаў у жыцці асобы.

Сёння роўназначнымі выкарыстоўваюцца тэрміны «эмацыйная лексіка» (В.К. Харчанка), «эмацыйна-экспрэсіўная лексіка» (В.А. Яфімаў), «эмацыйна афарбаваная лексіка» (Я.Ф. Пятрышчава), аднак найбольш пашыраным і агульнапрызнаным з'яўляецца паняцце «эмацыйна-ацэначная лексіка» (В.І. Шахоўскі). Паводле шэрагу даследчыкаў (А.М. Бабкін, Е.М. Галкіна-Федарук, М.М. Бажэнаў, К.А. Цімафееў, Д.М. Шмялёў і інш.) пласт эмацыйна-ацэначнай лексікі складаецца з слоў:

1) якія характарызуюць адчуванні, эмоцыі, настрой, пачуцці, адносіны да прадмета выказвання (*сумаваць, любіць, смех, пакорлівасць* і інш.);

2) якія даюць ацэнку прадмета, з'явам, адносінам са станоўчага ці адмоўнага боку (*добры, моцны, злы, палахлівы* і інш.);

3) у якіх эмацыйныя адносіны да выказвання выражаюцца граматычна, афіксамі эмацыйнай ацэнкі (*кветачка, буслік, мамуля*);

4) маўленчага этыкету, якія выяўляюць адносіны да аб'екта выказвання.

Эмацыйна афарбаваная лексіка дазваляе, з аднаго боку, перадаць эмоцыі, экспрэсію, настрой, з другога – выявіць адносіны да іншай асобы (*хваліць, крытыкаваць, раіць, падтрымліваць* і інш.) і ў выніку пабуджаць яе да пэўных дзеянняў. Такімі словамі, як *«лепш», «горш», «дрэнна», «хораша», «добра», «люблю», «не люблю», «падабаецца», «не падабаецца»*, педагог дае ацэнку ўчынкам і паводзінам дзіцяці, імкнецца выклікаць у яго адваротную рэакцыю. Псіхолагі (Л.С. Выгоцкі, А.Н. Лук, С.Л. Рубінштэйн) лічаць, што вербальнае выяўленне эмоцый неабходна для ўсведамлення асобай эмацыйнага стану іншых людзей і сваіх уласных эмацыйных перажыванняў. Эмацыйнасць маўлення ў значнай ступені вызначае эфектыўнасць узаемадзеяння дзіцяці з дарослымі і аднагодкамі (Б.Г. Ананьеў, А.А. Бадалёў), характарызуе ўзровень засваення асобай маральна-этычных норм (В.Р. Шчур, Р.С. Якабсан).

Развіццё эмацыйнасці маўлення з’яўляецца элементам паўнавартаснага маўленчага развіцця дзіцяці, падрыхтоўкі яго да навучання ў школе. Удасканаленне эмацыйнага кампанента маўлення садзейнічае дакладнасці, вобразнасці і эмацыйнасці выражэння дзецьмі думак, павышае культуру маўленчых зносін, стымулюе развіццё звязнага маўлення, дазваляе пазбегнуць манатоннасці і невыразнасці дыкцыі, празмернага запавольвання ці паскарэння тэмпу маўлення, незавершанасці гучання, якія ўплываюць на ўспрыманне зместу, эмацыйны сэнс выказвання. Спецыялісты ў галіне дзіцячага маўлення (М.М. Аляксеева, А.А. Стаўцава, А.С. Ушакова, В.І. Яшына і інш.) сцвярджаюць важнасць эмацыйна-ацэначнай лексікі для эмацыйнага развіцця і маральнага выхавання дзяцей, павышэння сацыяльнай актыўнасці асобы, удасканалення яе сацыяльных кантактаў з акаляючымі.

Практыка сведчыць аб беднасці эмацыйна-ацэначнай сферы дзяцей, пераваза ў іх агульнаацэначнай лексікі, несфарміраванасці выразнасці маўлення, няўменні інтанацыйна афармляць выказванне, няздольнасці пазбегнуть аднастайнасці, паўтораў, тыповых маўленчых канструкцый, несфарміраванасці ўмення перадаваць уласныя эмацыйныя адносіны да з’яў і прадметаў. У многіх дашкольнікаў пашыраны праблемы з маўленчымі паўзамі, дзецям цяжка вызначыць патрэбны тэмп маўлення, радзей – падабраць адпаведную гучнасць. Эмацыйныя адносіны да аб’екта выказвання ў дашкольнікаў найчасцей праяўляецца праз ужыванне слоў з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі *(«траўка», «лісцік», «пясочак», «жоўценькі»)*, суфіксамі ацэнкі *(«працаўнічок», «Лізачка», «ваўчышча»)*, азначэннямі (*«прыгожы», «вялікі», «маленькі»*).

Педагогі ўстаноў дашкольнай адукацыі адзначаюць рост у дзяцей маўленчых хібаў і парушэнняў, што стала вынікам звядзення да мінімуму непасрэдных маўленчых зносін у сем’ях і стыхійнасці працэсу развіцця маўлення, калі на яго ўплывае тэлебачанне, камп’ютар, а не лінгвакамунікатыўнае асяроддзе. М.А. Цярноўская звязвае недахопы ў камунікатыўных навыках дзяцей з несфарміраванасцю ўменняў разумець эмацыйны стан іншых, выражаць уласныя эмоцыі праз міміку, жэсты, інтанацыю: «Апошнім часам усё часцей сустракаюцца дзеці з невыразным і неэмацыйным маўленнем. Гэта звязана з рознымі маўленчымі паталогіямі, псіхічнымі парушэннямі ў дзіцяці. Многія дзеці завучваюць тэксты вершаў ці ролі да казак-драматызацый, аднак не ўмеюць перадаць характар герояў, іх настрой. Адсутнасць бачнай эмацыйнасці і манатоннасць голаса, парушэнне маўленчага рытма і іншых элементаў не садзейнічаюць камунікацыі такіх дзяцей, пагаршаюць іх адаптацыю ў грамадстве» [2, с. 330].

Усё гэта абумоўлівае неабходнасць пошуку аптымальных метадаў і сродкаў развіцця звязнага маўлення, удасканалення эмацыйнасці маўлення дзяцей. Даследчыкі прапаноўвалі фарміраваць эмацыйнасць маўлення ў працэсе музычнай дзейнасці (Б.У. Асафьеў, А.А. Мядзведзева, Н.А. Рычкова і інш.), азнаямлення дзяцей з прыродай (Л.І. Ціхеева, Л.М. Вадавозава, Н.Ф. Вінаградава), з творамі выяўленчага мастацтва (Н.П. Са-

куліна, Т.С. Камарова, Н.М. Зубарава), творамі мастацкай літаратуры (Н.С. Карпінская, А.Я. Шыбіцкая, Л.А. Пеньеўская, Р.І. Жукоўская, Л.М. Гуровіч, Л.Я. Панкратава).

Шэраг даследчыкаў (Б.Г. Ананьева, В.С. Мухіна, П.М. Якабсан і інш.) адзначаюць, што эмацыйнасць з'яўляецца прыродна дадзенай базіснай каштоўнасцю дзяцей дашкольнага ўзросту, выконвае камунікатыўную, сацыялагізуючую, развіццёвую, эмацыягенную, прагнастычную функцыі. Дзеці па сваёй прыродзе эмацыйна ўражлівыя, іх мова яркая, аднак гэта неўсвядомленая, міжвольная выразнасць; у выказваннях, мініцы і жэстах дзяцей назіраецца стрыманасць, не адбываецца далейшага развіцця ў дзяцей свядомых формаў эмацыйнасці маўлення. У выніку яны могуць разумець эмацыйнасць маўлення, але актыўна не ўжываць ў сваім маўленні эмацыйна ацэначнай лексікі і невербальных элементаў эмацыйнасці. Таму ў маўленчым развіцці дзяцей неабходна ісці ад простага капіравання, рэпрадукцыі лексіка-інтанацыйных сродкаў выразнасці і эмацыйнасці гаворкі дарослага, ад умення выказваць разнастайныя пачуцці (пяшчоту, гонар, трывогу, смутак, цікавасць, здзіўленне, сумненне, крыўду, сорам, спачуванне і інш.) і кантраляваць свае эмоцыі да прадуктыўнай перадачы жвавасці і натуральнасці розных інтанацый, да ўмення адчуваць і ацэньваць эмоцыі іншых (твор быў прачытаны весела, сумна, павольна, ціха, загадкава, жартаўліва ці сур'ёзна; выхавацель пакрыўдзіўся).

У асваенні эмацыйнасці маўлення важная роля належыць штодзённаму маўленню педагога як узора, эталона для дзяцей. Выхавацель дэманструе мяккі, ветлівы тон, выказвае розныя эмоцыі (здзіўленне, адабрэнне, падбадзёрванне, асуджэнне і інш.), дапамагае дашкольнікам засвоіць невербальныя сродкі камунікацыі, натуральнасць мімікі, жэстаў, рухаў, поз. Выхавацель у сваім маўленні дае прыклады ацэнак адказаў дзяцей, іх пераказаў, апавяданняў, творчых сачыненняў. Дзецям цяжка самім даць ацэначнае выказванне, гэтаму іх трэба вучыць на прыкладзе літаратурных твораў. У такім выпадку педагог прапаноўвае паразважаць: «Добра ці дрэнна паступіў герой казкі?», «Як бы вы паступілі на месцы героя?», «Ці мог бы герой паступіць інакш?». У працэсе першапачатковага знаёмства і аналіза твора дзяці заўважаюць і паўтараюць трапныя выразы, цікавыя і незвычайныя фразы, эмацыйна адгукаюцца на змест, «ужываюцца» ў твор, суперажываюць і спачуваюць героям. Эфектыўна выкарыстоўваць пераказ літаратурных твораў, завучванне на памяць, складанне фраз з эмацыйна-экспрэсіўнай лексікай, творчае сачыненне, гульні і практыкаванні, драматызацыі, інсцэніроўкі і інш. Педагог мае магчымасць карэкціраваць дзіцячую раздражнёнасць, неабгрунтаваныя перапады настрою, павышаную схільнасць да слёз праз стымуляванне зацікаўленасці гульнёй і актыўнасці ў вербальных зносінах.

Даследчыкі падкрэслівалі ранняе ўзнікненне ў маўленні дзяцей слоў эмацыйнай ацэнкі (А.М. Гвоздзеў, М.І. Лісіна, В.К. Харчанка), адзначалі перавагу ў лексіконе старэйшых дашкольнікаў і вучняў першых класаў на пачатковым этапе навучання эмацыйна-ацэначна афарбаваных слоў, утвораных з дапамогай суфіксаў (М.І. Амарокава, Т.А. Налімава), сведчылі аб пашыранай замене дзецьмі памяншальна-ласкальных форм назоўнікаў і прыметнікаў невербальнымі сродкамі зносін (Л.А. Калунова, А.І. Лаўрэнцьева, Е.М. Струніна). Гэта могуць быць прыметнікі (*светлы, цудоўны, прыемны, прыгожы* і інш.) або словы з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі (*бабуля, сыночак, дачушка, коцік, сонейка, ціхенька*), шматзначныя словы з негатыўным адценнем значэння (*варона, папугай, змяя, мядзведзь, прамаргаць*). Многія словы ўтрымліваюць у сваім лексічным значэнні прамую ацэнку фактаў, з'яў, прымет, даюць пэўную характарыстыку людзей: станоўчую (*дапытлівы, кемлівы, працавіты*) і адмоўную (*гультай, благі, злы, сварлівы, хітры* і інш.).

Эмацыйную лексіку дашкольнікаў прадуктыўна фарміраваць на аснове развіцця іх эмацыйнай сферы, псіхічных працэсаў. Дзяцей важна вучыць правільна разумець розныя эмацыйныя станы выхавацеля ў непасрэдных зваротах да дзяцей *(«Мне гэта не па-*

*дабаецца», «Так не трэба рабіць, а то дзеці разззлуюцца», «Каб нікога не пакрыўдзіць, цукеркі трэба раздаць усім дзецям»* і інш.), вучыць суперажываць іншым людзям, ацэньваць учынкі сяброў і свае ўласныя, суадносячы іх з пэўнымі маральнымі нормамі.

Каштоўным сродкам развіцця эмацыйнасці маўлення ў малодшым і сярэднім дашкольным узросце з'яўляюцца фальклорныя творы (вершы, загадкі, калыханкі, забаўлянкі, прымаўкі, песні і інш.) з характэрнымі ім запамінальнасцю, лаканізмам, гучнасцю, рытмічнасцю, напеўнасцю, займальнасцю. У іх звычайна адлюстраўны зразумелыя маленькім слухачам падзеі, эмоцыі, настрой, перажыванні, а прамое супрацьпастаўленне станоўчага і адмоўнага спрыяе ўзнікненню эмпатыі ў адносінах да герояў твра, фарміруе ўменне пераносіць вобразна-выяўленчыя сродкі фальклора ў паўсядзённае гутарковае маўленне, стымулюе самастойны пошук выразных сродкаў для стварэння вобраза, заахвочвае да імправізацыі маналогаў і дыялогаў у гульні-драматызацыі.

Развіццё эмацыйнасці маўлення прадугледжвае ўдасканаленне ўменне фармуляваць пытанні, слухаць і ацэньваць чужое маўленне, эмацыйна пераказваць тэксты. Традыцыйна эмацыйнасць маўлення фарміруецца ў дзяцей на занятках, прысвечаных навучанню складаць апавяданні-апісанні, аднак не менш прадуктыўнымі могуць стаць заняткі па навучанні пераказу, апавядання-разважання і сачынення казак.

У старэйшым дашкольным узросце развіццю інтанацыйнай палітры маўлення, фарміраванню ўмення ўглядацца, назіраць, ацэньваць учынкі людзей у розных сітуацыях садзейнічаюць этычныя гутаркі і абмеркаванне фрагментаў мастацкіх твораў, якія ўтрымліваюць эмацыйную лексіку. Перспектыўна выкарыстоўваць фальклорныя творы (казкі, загадкі, прымаўкі), у якіх героі выразна размежаваны на станоўчых і адмоўных, даецца прамая характарыстыка персанажаў і іх учынкаў. Ужыванне нагляднасці (разглядванне іллюстрацый, фотаздымкаў, рэпрадукцый) садзейнічае павышэнню дзіцячых здольнасцей паўнавартасна карыстацца эмацыйна-выяўленчымі магчымасцямі мімікі. Практыка сведчыць аб эфектыўнасці ролевых гульняў, калі дзеці імкнуцца перадаць эмоцыі казачнага персанажа: сум хітрай лісы, здзіўленне няўклюднага мядзведзя, радасць зайчыка, сполах вожыка, злосць воўка і інш. Важна, каб настрой герояў дзеці імкнуліся перадаць праз інтанацыю (паскарэнне і запаволенне тэмпу, павелічэнне і паніжэнне сілы голасу, лагічны націск), сродкі фразеалогіі (*светлы настрой; упарты, як баран; цяжкі чалавек* і інш.). Станоўчы вынік дае зварот да славесных гульняў тыпу «Скажы іншымі словамі» (на падбор антонімаў), «Падбяры падобнае слова» (на падбор сінонімаў).

Духоўны крызіс сучаснага грамадства ўплывае на зніжэнне культуры маўленчай камунікацыі дарослых і адпаведна павялічвае ў дзіцячым лексіконе колькасць адзінак зніжанай эмацыйна-экспрэсіўнай афарбоўкі, прастамоўных форм, вульгарызмаў, жарганізмаў. Спецыялісты ў галіне дашкольнай педагогікі і лагапедыі адзначаюць паступовае пагаршэнне маўленчых уменняў дзяцей, узрастанне маўленчых парушэнняў, стрэсавасць і трывожнасць дзяцей пры неабходнасці пабудовы звязнага маналагічнага ці дыялагічнага прадуктыўнага выказвання.

У такіх умовах дзіцяці важна далучыць да агульналюдскіх каштоўнасцей, прывіць спрадвечныя маральна-этычныя эталоны паводзін і маўленчай камунікацыі, нормы традыцыйнай нацыянальнай культуры. Працу па выпрацоўцы маўленчага этыкету важна пачынаць менавіта ў дашкольным узросце, калі закладваюцца асновы камунікатыўнай культуры і асноўных маўленчых уменняў і навыкаў як элементаў міжасабовых зносінаў, калі маленькая асоба выяўляе абсалютную гатоўнасць да пазнання свету і яшчэ не знаходзіцца ў палоне маўленчых стэрэатыпаў. Пры гэтым ігнараванне спецыяльна арганізаванай працы па маўленчым этыкеце выклікае стыхійнасць узнікнення ў дзяцей негатыўных форм паводзін.

Шэраг даследчыкаў (Л.І. Бажовіч, А.А. Лявонцьеў, А.М. Шахнаровіч і інш.) адзначалі, што ў перыяд пераходу з устаноў дашкольнай адукацыі ў школу дзеці перажываюць асаблівы дыскамфорт, звязаны з праблемай міжасабовых зносін з дарослымі і аднагодкамі. Н.А. Халезава адзначае, што «дзеці, калі сутыкаюцца з новымі для іх адносінамі, інтэрпрэтуюць іх па-свойму. Адны ўспрымаюць іх як адмену розных (у прыватнасці ўзроставых) абмежаванняў, норм і правілаў паводзін, становяцца фамільярнымі, развязнымі, нават грубымі; іншыя губляюцца, замыкаюцца ў сабе, зводзяць да мінімуму зносіны» [3, с. 4]. У гэты перыяд у дзіцяці закладваюцца асновы маральных прынцыпаў, актыўна развіваецца эмацыйная сфера асобы, фарміруецца прадуктыўны вопыт паўсядзённай камунікацыі У такіх умовах маўленчы этыкет здольны выконваць функцыю рэгулявання паводзінаў, псіхаэмацыйнага стану, а выхавацель павінен фарміраваць у дзяцей уменне наладжваць станоўчы кантакт, выхоўваць жаданне станоўчых адносінаў з дарослымі і іншымі дзецьмі, імкненне кантраліраваць сваё маўленне, эмоцыі і настрой. Слушным з'яўляецца меркаванне Н.А. Халезавай, якая адзначае, што, «засвойваючы этыкетную лексіку, дзіця "прысвойвае" частку сацыяльнага вопыту народа, авалодвае культурна-маўленчымі эталонамі, характэрнымі для таго культурнага асяроддзя, у якое трапіла. Увядзенне славесных формул маўленчага этыкета ў агульную сістэму маўленчага ўзаемадзеяння дашкольніка з акаляючым асяроддзем дарослых і аднагодкаў будзе садзейнічаць фарміраванню камфортнага камунікатыўнага поля і аказваць безумоўны ўплыў на духоўны свет дзіцяці» [3, с. 5]. Аднак у сучасных установах дашкольнай адукацыі, як сведчаць практыка, педагогі рэдка выяўляюць актыўнасць у стварэнні спецыяльнага маўленчага асяроддзя, якое б развівала і стымулявала «этыкетнвую» лексіку дзяцей.

Асноўнымі задачамі фарміравання маўленчага этыкету ў дзяцей дашкольнага ўзросту з'ўляюцца тлумачэнне дзецям новых для іх выразаў, фарміраванне навыкаў выкарыстання этыкетных формул ветлівасці ў паўсядзённым маўленні, фарміраванне ўмення суправаджаць этыкетную лексіку аднаведнай інтанацыяй, жэстамі і мімікай, развіццё этычнай адказнасці дзіцяці за свае маўленчыя паводзіны, развіццё ўмення выкарыстоўваць словы ветлівасці як нормы этыкетных паводзін, фарміраванне ўмення прадбачаць сутуацыі зносінаў, правільна іх ацэньваць і ў залежнасці ад гэтага ўжываць маўленчыя нормы камунікацыі.

Эксперыментальнае даследаванне, праведзенае ва ўстанове дашкольнай адукацыі «Яслі-сад № 14 г. Брэста», сведчыць аб няўстойлівасці ў выкарыстанні формул ветлівасці дзецьмі, пашыранай падмене этыкетных слоў мімікай і жэстамі, неабходнасці стымулюючых дзеянняў з боку педагога па выкарыстанні этыкетных маўленчых эталонаў у паўсядзённай камунікацыі, паказвае, што эфектыўнасць фарміравання ўмення карыстацца формуламі маўленчага этыкету забяспечваецца пэўнай паслядоўнасцю працы: завучванне выразаў *(«Добрай раніцы», «Добры дзень», «Прывітанне», «Калі ласка», «Дзякуй», «Усяго добрага», «Смачна есці», «Прыемнага апетыту»* і інш.), шматразовае ўспрыняцце выразаў з мовы педагога, паўтор выразаў у гульнях і практыкаваннях, самастойнае выкарыстанне выразаў у паўсядзенным маўленні і гульнявых сітуацыях. Практыка паказвае, што дзеці без праблем засвойваюць формулы прывітання, развітання, падзякі, бо яны паўтараюцца дзецьмі ў стандартызаваных сітуацыях у гаворцы з бацькамі і роднымі. У сітуацыях кампліментаў, прапановы, запрашэння, спачування *(«Вазьміце, калі ласка», «Давайце, я дапамагу», «Дзякуй, не хвалюйцеся», «Прабачце, я сам»* і інш.) дзеці выяўляюць пэўныя хібы: яны не заўсёды схільны адзначыць адраснасць і матывіроўку выказванняў. Асаблівую ўвагу неабходна надаваць тлумачэнню неабходнасці звароту на «Вы» да дарослых. Для вырашэння дадзенай праблемы прадуктыўна даваць дзецям прыклады канкрэтных сітуацый: размова па тэлефоне, у грамадскім транспарце, у гасцях, запрашэнне бабулі да стала і інш. Пры гэтым прыя-

рытэт павінен аддавацца дыялагічнаму маўленню, стварэнню мадэляў дыялогу ацэначнага характару, мадэляванню маўленчых сітуацый і ролевых гульняў на аснове ўсвядомленага выкарыстання дашкольнікамі формул ветлівасці. Такім чынам, формулы маўленчага этыкету забяспечваюць дзіцяці камфортна-пазітыўную атмасферу зносін, папярэджваюць псіхічныя нагрузкі, якія могуць узнікнуць ў працэсе маўленчай камунікацыі.

Працэс фарміравання маўленчага этыкету ў дзяцей неабходна пачынаць з малодшага дашкольнага ўзросту, калі дзецям на спецыяльна арганізаваных занятках і па-за імі даюцца ўзоры формул ветлівасці, прыводзяцца прыклады іх выкарыстання ў прадуктыўным маўленні, ствараюцца спецыяльныя гульнявыя сітуацыі, скіраваныя на пазітыўнае выкарыстанне на практыцы этыкетных клішэ. Культурна-маўленчым эталонам з'яўляецца маўленне педагога, які актывізуе, стымулюе, вучыць, выпраўляе, карэкціруе дзейнасць дзяцей, выкарыстоўваючы шырокі дыяпазон педагагічных метадаў (інсцэніраванне, гульні-драматызацыі, чытанне літаратурных твораў, завучванне вершаў на памяць, этычныя гутаркі, разглядванне дыдактычных рэпрадукцый, дыдактычныя гульні і практыкаванні) і прыёмаў (тлумачэнне, паўтарэнне, ацэнка, аналіз).

Найбольш прадуктыўным шляхам азнаямлення дзяцей малодшага дашкольнага ўзросту з эмацыйна афарбаванымі лексічнымі адзінкамі на спецыяльна арганізаваных занятках з'яўляецца комплексна-тэматычны на аснове інтэграцыі розных відаў дзейнасці, а эфектыўнымі метадамі і прыёмамі – чытанне твораў выхавацелем, узор выразнага чытання каго-небудзь з дзяцей, інсцэніраванне ўрыўкаў з тэксту казак, пераказ казак дзецьмі, разыгрыванне па ролях казак і забаўлянак, народныя гульні («Ідзе каза рагатая», «Каршун і наседка», «Гусі» і інш.), выкарыстанне лічылак, выкарыстанне скарагаворак, завучванне прымавак, гульні («Тэлефон», «Сустрэча лялькі», «Крама», «Пошта»), карагоды, гульнявыя практыкаванні, уключэнне паказу асобных навыкаў маўленчых зносін у гульню, гульні-драматызацыі, прыдумванне і прагаворванне эмацыйных фраз па ўзоры, тлумачэнне і інш. Пажадана спалучаць на адным занятку розныя метады і прыёмы, ствараць умовы для праяўлення дзецьмі эмоцый, пачуццяў, жаданняў, прычым у натуральным публічным маўленні, каб дзеці не саромеліся прысутнасці слухачоў.

Псіхолагі (Л.С. Выгоцкі, І.А. Зімняя, Д.Б. Эльконін і інш.) адзначаюць: у дзяцей пераважае канкрэтна-вобразнае мысленне, яны найчасцей выдзяляюць найбольш яркія, аднак не заўсёды істотныя прыметы з'яў і прадметаў. Дашкольнікаў важна навучыць выдзяляць самае асноўнае і перадаваць яго ярка, так, каб уласныя адносіны і эмоцыі да прадмета выказвання, яго ацэнку заўважылі іншыя. У малодшым дашкольным узросце з гэтай мэтай можна выкарыстаць сюжэтна-ролевыя гульні, гульні з лялькамі, гульні-драматызацыі, гульнявыя практыкаванні, накіраваныя на выпрацоўку практычных этыкетных сітуацый (як ветліва сустрэць гасцей, папрасіць у сябра дапамогі, спытаць незнаёмага чалавека і інш.). Асабліва прадуктыўна выкарыстоўваць інтанацыйныя гульні («Дыктар», «Каментатар», «Пошта», «Камандзір», «Тэлефон», «Гандляр», «Сустракаем гасцей») і тэатралізаваныя гульні («Пазнай, хто я?», «Хто ў казцы лішні?» і інш.). Акрамя спецыяльных заняткаў, для адпрацоўкі выразнасці маўлення дзяцей можна выкарыстоўваць розныя віды дзейнасці (музычную, фізкультурную, выяўленчую). Развіццё выразнага маўлення дзяцей прадугледжвае развіццё ў іх эмацыйнасці, творчых здольнасцей, вобразнай памяці, жыццёвага вопыту.

Магчымасці дзіцяці адлюстроўваць эмоцыі і ацэнку непасрэдна залежаць ад удасканалення ў яго маўленні кампанентаў інтанацыйнай выразнасці (мелодыкі, інтэнсіўнасці, працягласці, тэмпа і тэмбра вымаўлення), што ажыццяўляецца праз фарміраванне ўзаемадзеяння механізмаў дыхання, голасаўтварэння і артыкуляцыі. Пастуова пашыраецца інтанацыйны спектр маўлення дзіцяці (інтанацыі пытання, здзіўлення, задавальнення, просьбы, патрабавання, папрока, крыўды і інш.), фарміруецца патрэба ў эмацыйнай маўленчай камунікацыі. Асаблівае месца ў гэтай працы належыць малым жан-

рам фальклору, лаканічным і дакладным па форме, глыбокім і нескладаным па змесце, рытмічным і запамінальным. Яны садзейнічаюць развіццю рухомасці і гібкасці артыкуляцыйнага апарата, дыкцыйнай працы, фарміруюць правільнае гукавымаўленне, дапамагаюць засваенню дзіцяці інтанацыйнага багацця мовы, differently рознага тэмпу вымаўлення. Напрыклад, дакладнасць дыкцыі і звонкасць гукавымаўлення адпрацоўваецца з дапамогай забаўлянак і скарагаворак, гучнасць удасканальваецца ў калыханках, песнях, вершах; тэмп – лічылкамі, скарагаворкамі, казкамі, інтанацыя – загадкамі і забаўлянкамі, тэмбр – на матэрыяле казак.

У сярэднім дашкольным узросце адпрацоўваюцца навыкі звязнага рэпрадуктыўнага і нескладанага прадуктыўнага маўлення з дапамогай гульнявых практыкаванняў («Якія словы вы пачулі?», «Як пачаць інакш?», «Хто раскажа інакш?», «Падбяры найбольш прыдатнае слова», «Пачні казку», «Вызначы казачны канчатак», «Намалюй словамі адгадку», «Скажы інакш», «Закончы прыгожае словазлучэнне», «Пазнай, хто сказаў», «Назаві словы, якія робяць мастацкі твор пяшчотным», «Падбяры прыгожыя словы да пэўнай рэчы», «Знайдзі незвычайнае слова»), розных відаў пераказаў (скарочаны, выбарачны, па ўяўных ілюстрацыях, ад імя іншага героя), «ролевых дыялогаў».

Засваенне колькаснага і якаснага лексічнага складу мовы не з’яўляецца самамэтай. Аснову лексікона дашкольніка павінны складаць найбольш пашыраныя і неабходныя для зносін з дарослымі і іншымі дзецьмі словы, што спрыяе сацыялагізацыі дзіцяці, далучэнню яго да свету чалавечых каштоўнасцеў, выпрацоўцы такіх маральных якасцей, як добразычлівасць, спагадлівасць, ветлівасць, годнасць, фарміраванню ўмення правільна і да месца выказваць пачуцці павагі, любові, радасці, здзіўлення, дакору, незадавальнення, суму, гонару, паглыбленаму засваенню этычных норм і ацэнак (хараша – дрэнна, добры – злы, сяброўства – варожасць і інш.). У слоўнік дзіцяці важна ўводзіць розныя часціны мовы (*сум, сумаваць, сумны; смех, смяяцца, смешна*), весці працу па засваенні сінонімаў (*радасць, шчасце, вяселле*) і антонімаў (*працавіты – лянівы, смелы – баязлівы*). У сярэднім дашкольным узросце прадуктыўна выкарыстоўваць практыкаванні, прысвечаныя характарыстыцы персанажаў, пытанні-падказкі, славесныя практыкаванні, чытанне з гульнявымі дзеяннямі і рухамі, ацэнка чужых выступленняў, самаацэнка запісаў вершаў, сумеснае з выхавацелем вымаўленне, славеснае апісанне кніжных ілюстрацый, гутарка пасля знаёмства з творам, праслухоўванне аўдыёзапісаў, падбор параўнанняў, эпітэтаў, антонімаў, сінонімаў, рыфмы да слоў і словазлучэнняў з фальклорнага твора малой формы, чытанне з музычным суправаджэннем, перастварэнне фальклорнага твора малой формы (прыказкі, загадкі, фразеалагізма, песні) ў апавяданне ці казку, харавое спяванне фальклорных твораў і інш.

У старэйшых групах пры гэтым пераважаюць прыёмы, разлічаныя на элементы дзіцячай творчасці: інсцэніраванне, гутарка, творчае апавяданне, творчыя заданні, гульні-драматызацыі, славеснае маляванне, славесныя практыкаванні, выкананне творчых заданняў. Фальклорныя творы эфектыўна выкарыстоўваць падчас фарміравання ўменняў інтэрпрэтаваць метафару ў загадках, адбіраць трапныя і дакладныя словы ў пераказах казак, ужываць эпітэты і параўнанні ў прымаўках. Мэтанакіраваная, загадзя спланаваная праца, якая ўключае этапы падрыхтоўкі (адбор твораў, распрацоўка метадаў і прыёмаў, стварэнне неабходнага развіццёвага асяроддзя) і рэалізацыі (паэтапнае ўдасканаленне мастацкага ўспрыняцця, вобразнасці і эмацыйнасці, накапленне вопыта маўленчай выразнасці), садзейнічае абуджэнню цікавасці дашкольнікаў да выразнасці маўлення сродкамі вуснай народнай творчасці, якім уласціва сюжэтная займальнасць, маўленчая вобразнасць і эмацыйнасць, лексіка-інтанацыйная выразнасць, імправізацыйны характар выканання, што ў цэлым спрыяе выпрацоўцы ў дзяцей маўленчай выразнасці.

Кіруючыся пастулатам аб неабходнасці «апераджальнай ініцыятывы дарослага» (А.А. Смірнова), педагогу неабходна стварыць такія ўмовы, калі дзіця само выяўляла б

самастойную актыўнасць, спрабавала асэнсаваць і ацаніць чалавечыя ўчынкі. З гэтай мэтай выхавацель прапануе разыгрываць сітуацыі з казак і жыцця, у якіх неабходна максімальна выкарыстаць міміку. Напрыклад, дзеці паказваюць, як здзівяцца, калі знойдуць у лесе вялікі грыб; як спалохаюцца, калі сустрэнуць тыгра; як будуць сумаваць, калі мама захварэе; як здзівяцца вожыку, якога прынясе бацька і інш. Асаблівую ўвагу неабходна надаваць арганізацыі сумеснай дзейнасці дашкольнікаў, калі ўзнікае неабходнасць і жаданне дапамагчы сябру, перажыць агульную радасць ад поспеху, атрымаць падтрымку аднагодкаў.

Такім чынам, фарміраванню эмацыйнасці маўлення дашкольнікаў садзейнічае спалучэнне разнастайных метадаў і прыёмаў пры ўмове паступовага ўскладнення працы ад рэпрадуктыўных дыялагічных да прадуктыўных маналагічных выказванняў. Арганізаваная праца па развіцці эмацыйна-ацэначнай лексікі на занятках і па-за іх межамі спрыяе якаснаму ўдасканаленню слоўніка дзіцяці, уплывае на якасць звязных выказванняў, садзейнічае абуджэнню ўяўленняў і эмоцый дзяцей і перанясенню атрыманых раней уражанняў у паўсядзённае маўленне, развіццю ўсвядомленага выкарыстання вобразных сродкаў у адпаведнасці з камунікатыўнымі мэтамі і маўленчай сітуацыяй.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Аванесова, Н. В. Эмоциональность и экспрессивность – категории коммуникативной лингвистики / Н. В. Аванесова // Вестн. Югорского гос. ун-та. – 2010. Вып. 2 (17). – С. 5.

2. Терновская, М. А. Развитие мимической и интонационной выразительности речи у дошкольников / М. А. Терновская // Дошкольное образование в XXI веке : сб. материалов Всерос. науч. конф. с междунар. участием / под ред. Н. Ш. Сыртлановой и Г. Р. Шафиковой. – Уфа : Изд-во Башкир. гос. пед. ун-та им. М. Акмуллы, 2013. – 574 с.

3. Халезова, Н. А. Преемственность в обучении речевому этикету детей старшего дошкольного и младшего школьного возраста в процессе изучения русского языка [Электронный ресурс] / Н. А. Халезова. – Режим доступа: http://www.dissercat.com/content/preemstvennost-v-obuchenii-rechevomu-etiketu. – Дата доступа: 10.03.2017.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 16.03.2018

***Smal Viach.M.*** **Formation of the Emotionally-Estimated Lexicon of Pre-School Age Children**

*The technique of forming emotional vocabulary of preschool children is considered, the influence of emotional and expressive vocabulary on general language development of the child's personality is analyzed, the process of introduction of etiquette vocabulary to active vocabulary of children is described disclosed effective methods and techniques of familiarization of children of preschool age with emotionally evocative lexical units at specially organized classes on the basis of cluster approach and the integration of the various activities is disclosed.*